http://edoc.bseu.by:8080

访问日期: 04.09.2020. = Чжан Вэйвэй (директор) // Китайский исследовательский институт Фуданьского университета [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.cifu.fudan.edu.cn/a3/7b/c520a107387/page.htm. – Дата доступа: 04.09.2020.

2. 张维为．文明醒国家 / 张维为 // 上海：上海人民出版社，2017. – 226 页. = Чжан, Вэйвэй. Цивилизованное государство / Вэйвэй Чжан // Шанхай: Шанхайское народное издательство, 2017. – 226 с.

3. 张维为：一带一路：千年未有之大变局 ［电子资源］ // 求是网． – 访问方式: http://www.qstheory.cn/international/2017-05/11/c_1120956385.htm. – 访问日期: 01.09.2020. = Чжан Вэйвэй: Один пояс – один путь: великие перемены невиданные тысячу лет [Электронный ресурс] // Цюшиван. – Режим доступа: http://www.qstheory.cn/international/2017-05/11/c_1120956385.htm. – Дата доступа: 01.09.2020.

**Г. І. Басава**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

*(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)*

# ПРЫЯРЫТЭТЫ АДУКАЦЫЙНАЙ СІСТЭМЫ КІТАЙСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ ЯК ВАЖНЕЙШАЯ ЎМОВА І ФАКТАР ПАСПЯХОВАГА САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ КРАІНЫ

*Адукацыя з'яўляецца фундаментам, які служыць развіццю кантактаў і павышэнню ўзроўню даверу паміж дзяржавамі і народамі. Прыярытэтнай умовай і фактарам паспяховага сацыяльна-эканамічнага развіцця КНР з'яўляецца падрыхтоўка адукаваных спецыялістаў, здольных упэўнена і эфектыўна ўдзельнічаць у прафесійна-дзелавых, сацыякультурных і штодзённых зносінах. У апошнія гады беларуска-кітайскае супрацоўніцтва ў навукова-тэхналагічнай і адукацыйнай сферах дынамічна развіваецца. Адна з важнейшых задач дзейна-*

*сці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – развіццё міжнароднага супрацоўніцтва ў гэтым кірунку.*
**Ключавыя словы:** *Рэспубліка Беларусь, Кітайская Народная Рэспубліка, супрацоўніцтва, адукацыя, партнёрства.*

*Education is a basis for developing contacts and increasing the level of trust between states and people. The priority condition and factor for the successful socio-economic development of the PRC are the training of high-educated specialists who can confidently and effectively participate in professional, business, socio-cultural and daily communication. Over the last years Belarusian-Chinese cooperation in science, technology and education has been developing dynamically. Among the most important task of the Belarusian State University is to develop international cooperation in this area.*
**Keywords:** *Republic of Belarus, People's Republic of China, collaboration, education, partnership.*

Базавым фактарам для паспяховага ўсебаковага развіцця беларуска-кітайскага супрацоўніцтва з'яўляецца высокі ўзровень палітычных адносін і ўзаемадаверу Рэспублікі Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікі, супадзенне поглядаў па важнейшых пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця нашых краін і міжнароднай павесткі. За амаль трыццаць гадоў з дня ўсталявання дыпламатычных адносін назапашаны і пэўны вопыт гандлёва-эканамічнага, крэдытна-інвестыцыйнага, навукова-тэхнічнага і гуманітарнага супрацоўніцтва [4, с. 5].

Адным з кірункаў гуманітарнага супрацоўніцтва з'яўляецца супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, якая садзейнічае развіццю кантактаў, забяспечвае інтэлектуальнае, культурнае збліжэнне народаў абедзвюх краін. Без супрацоўніцтва ў гэтай сферы складана ўявіць развіццё паўнавартасных адносін у эканоміцы, палітыцы і іншых галінах. Стратэгічныя ідэі геаэканамічнай палітыкі «Адзін пояс і адзін шлях» не толькі садзейнічаюць развіццю партнёрскіх адносін паміж дзяржавамі, але і забяспечваюць значныя перспектывы ў сфе-

ры адукацыі і падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў. У кантэксце данай палітыкі ўстановы вышэйшай адукацыі краін – удзельнікі Новага Шоўкавага шляху павінны ўмацоўваць інавацыйныя тэхналогіі ў сферы адукацыі, удасканальваць сістэмы адукацыі, паляпшаць праграмы навучання і павялічваць колькасць навучэнцаў, спалучаць навучанне з практыкай [3, с. 30]. Вынікам гэтай працы з’яўляецца падрыхтоўка высокакваліфікаваных кадраў, вопыт у сферы адукацыі іншых краін, удасканаленне методыкі і сістэмы выкладання дысцыплін, павышэнне і паляпшэнне якасці выкладання па праграмах супрацоўніцтва з замежнымі краінамі і пашырэнне сферы супрацоўніцтва ў навучанні і выхаванні міжнародных спецыялістаў па розных галінах эканомікі. Падрыхтоўка высокакваліфікаваных кадраў мае важнае значэнне ў развіцці і інтэграцыі Кітая ў міжнародную супольнасць. Яна павышае ўнутраныя сілы эканамічнай вытворчасці краіны, усебаковае стымуляванне стратэгічных ідэй палітыкі Новага шоўкавага шляху «Адзін пояс і адзін шлях». Таму ў працэсе эканамічнага развіцця краіны кадры маюць асноўнае стратэгічнае значэнне, а высокакваліфікаваныя творчыя кадры з’яўляюцца элітным рэсурсам [1, с. 3–4 ].

Адзначым, што ў апошнія гады беларуска-кітайскае супрацоўніцтва ў сферы вышэйшай і дадатковай адукацыі дынамічна развіваецца. Павялічваецца колькасць універсітэтаў-партнёраў, з’яўляюцца новыя формы кантактаў паміж Беларуссю і Кітаем. Гэтаму садзейнічае і правядзенне ў Беларускім дзяржаўным універсітэце міжнародных навукова-практычных канферэнцый «Развіццё беларуска-кітайскага супрацоўніцтва ў сферы вышэйшай адукацыі ў рамках праекта “Адзін пояс і адзін шлях”» (г. Мінск, 26 кастрычніка 2017 года), «Сучасны Кітай: пабудова сацыялізму з кітайскай спецыфікай новай эпохі» (г. Мінск, 29 сакавіка 2019 года), навуковай канферэнцыі «Пытанні і перспектывы развіцця беларуска-кітайскіх ад-

носін у сферы адукацыі» (г. Далянь, 10 студзеня 2019 года) у межах адкрыцця Года адукацыі Беларусі ў Кітаі і інш.

Паміж беларускімі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі і ўніверсітэтамі КНР заключана больш за 350 дамоў аб супрацоўніцтве, якія паспяхова рэалізуюцца ў выглядзе двухбаковых навуковых праектаў, сумесных адукацыйных праграм, прадугледжваюць акадэмічныя абмены, стварэнне сумесных адукацыйных структур і навуковых лабараторый. За апошнія гады спектр напрамкаў дзейнасці беларуска-кітайскіх універсітэтаў стаў больш шырокі і разнастайны. Прыярытэтным з’яўляецца супрацоўніцтва ў галіне вышэйшай і дадатковай адукацыі.

Адным з першых універсітэтаў, які пачаў супрацоўнічаць з кітайскімі ўстановамі вышэйшай адукацыі, з’яўляецца Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Хуткае развіццё тэхналогій, новая арганізацыя вытворчасці, змены ў прафесійнай дзейнасці выклікаюць неабходнасць у павышэнні кваліфікацыі, набыцці новых ведаў. Зварот да адукацыі дарослых выкліканы таксама запытамі рынку працы, галоўныя сярод якіх – кампетэнтнасць і прафесіяналізм. У сучаснай сацыяльнай сітуацыі чалавечы капітал становіцца не менш, а можа, і больш значнай умовай развіцця грамадства, чым прыродныя багацці ці зручнае геаграфічнае/тэрытарыяльнае становішча краіны. Сярод фактараў, якія яго ствараюць, асобнае месца займае адукацыя як сістэма фарміравання інтэлектуальнага багацця нацыі, як адна з важнейшых сфер вытворчасці інавацый і фарміравання ключавых кампетэнцый людзей. Асобнае месца ў сістэме адукацыі займае адукацыя дарослых, паколькі дарослаcць – найбольш працяглы перыяд у жыцці чалавека. Уключанасць у працэс бесперапыннай адукацыі, або «сумешчаны спосаб жыццядзейнасці» (Л. І. Анцыферава), аказвае істотны ўплыў на ўсю сістэму жыццёвых адносін асобы. Гэтыя асаблівасці сучаснай сацыяльна-адукацыйнай сітуацыі далі магчымасць англійскаму

андрагогу П. Джарвісу заключыць, што «формы адукацыі для дарослых пачынаюць разглядацца ў якасці асноўнага, магістральнага кірунку, а не нейкага неабавязковага факультатыва». Таму навучанню і адукацыі дарослых належыць важнейшая роля ў працы над сучаснымі задачамі і праблемамі эканамічнага, палітычнага, культурнага і сацыяльнага характару.

Адной з важнейшых задач дзейнасці БДУ з'яўляецца развіццё міжнароднага супрацоўніцтва з КНР у галіне дадатковай адукацыі. Таму павышэнне кваліфікацыі розных катэгорый слухачоў – неад'емны складнік рэалізацыі стратэгіі стварэння сістэмы бесперапыннай адукацыі, прынятай Мемарандумам бесперапыннай адукацыі Еўрапейскага саюза ў 2000 годзе, якая шырока падтрымліваецца ва ўсім свеце, у тым ліку ў КНР. Так, у Беларускім дзяржаўным універсітэце ў Год адукацыі Беларусі ў Кітаі быў арганізаваны і праведзены шэраг адукацыйных праграм для розных катэгорый слухачоў КНР: для кіруючых работнікаў і спецыялістаў Чжэцзянскага Шужэн універсітэта, студэнтаў Ланьчжоўскага політэхнічнага ўніверсітэта, прадстаўнікоў Інстытута па навукова-тэхнічнай інфармацыі правінцыі Ганьсу. Актуальнасць распрацоўкі і рэалізацыі гэтых праграм вызначаецца тым, што ключавым рэсурсам развіцця ўстановы з'яўляецца прафесійная кампетэнтнасць, творчы патэнцыял і інавацыйная актыўнасць яго работнікаў, на што ўказваюць як самі праграмы, іх назвы («Современный университет в контексте модернизации высшего образования», «Научная, научно-техническая и инновационная деятельность в Белорусском государственном университете», «Русский язык как средство межкультурной коммуникации»), прызначаныя для розных катэгорый слухачоў, так і іх змест, які складзены ў адпаведнасці з запытамі кітайскага боку. Матэрыялы, уключаныя ў гэтыя праграмы, дазволілі слухачам атрымаць уяўленне аб арганізацыі кіравання ўніверсітэтам у галіне адукацыйнага працэсу і навуковых

даследаванняў. Вучэбныя модулі былі скіраваны на фарміраванне ведаў, уменняў і навыкаў па арганізацыі ўпраўленчай дзейнасці ва ўніверсітэце за кошт уключэння інфармацыі па рабоце з персаналам, сістэмнага ўяўлення аб арганізацыі навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці ў БДУ і Рэспубліцы Беларусь, прасоўвання вынікаў навуковых даследаванняў у інтэрнэце і сацыяльных сетках, падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, інтэрнацыяналізацыі адукацыі, гарманізацыі сістэмы адукацыі ў БДУ з еўрапейскімі тэндэнцыямі, моўнай падрыхтоўкі і практыкі міжкультурнай камунікацыі і інш. Прыведзеныя прыклады сведчаць пра галоўнае: выхад у 2016 годзе адносін Беларусі і Кітая на новы ўзровень – даверлівага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва – стаў базавым кампанентам далейшага паступальнага развіцця беларуска-кітайскага ўзаемадзеяння ў навукова-тэхналагічнай і адукацыйнай сферах [2, с. 150], якія ў 2019 годзе набылі новыя інавацыйныя фарматы, рэалізуемыя, у прыватнасці, у праграмах дадатковай адукацыі. Адукацыйныя праграмы, распрацаваныя для розных катэгорый слухачоў КНР, не толькі папаўняюць іх веды ў пэўных галінах, забяспечваюць прафесійны рост, але і ўмацоўваюць двухбаковыя адносіны, садзейнічаюць развіццю і ўмацаванню беларуска-кітайскага ўсебаковага даверлівага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, вызначаюць стратэгіі развіцця і адкрываюць новыя перспектыўныя кірункі міжнароднага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікі. Усё гэта сведчыць аб тым, што абедзве краіны зацікаўлены ў супрацоўніцтве, у пашырэнні кантактаў, у падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі сучасных кадраў. Непасрэдныя кантакты ўносяць важкі ўклад у ажыццяўленне праграм далейшага эканамічнага развіцця дзвюх краін, падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў. Асабліва надзённая гэтая задача ў фармаце рэалізацыі

праекта КНР «Адзін пояс і адзін шлях», які адлюстроўвае імкненне кітайскага народа да міру, эканамічнага і культурнага дыялогу з іншымі краінамі [5, с. 205].

Сацыяльна-палітычная сітуацыя ў свеце дыктуе неабходнасць рыхтаваць канкурэнтаздольных, адукаваных спецыялістаў, здольных упэўнена і эфектыўна ўдзельнічаць у прафесійна-дзелавых, сацыякультурных і штодзённых зносінах, што ўпэўнена і паступальна рэалізуе Кітайская Народная Рэспубліка і што з'яўляецца прыярытэтнай умовай і фактарам паспяховага сацыяльна-эканамічнага развіцця гэтай краіны.

## Літаратура

1. Дударева, Н. А. Интернационализация российской системы высшего образования: экспорт образовательных услуг (по материалам Всероссийского совещания проректоров по международной деятельности, Москва, 2009 г.) / Н. А. Дударева // Вестник ИГЭУ. – 2010. – Вып. 5. – С. 1–5.

2. Залесский, Б. Л. Доверительное всестороннее стратегическое партнерство: научно-технологический аспект / Б. Л. Залесский // Современный Китай: построение социализма с китайской спецификой новой эпохи : материалы Междунар. науч. конф., Минск, 29 марта 2019 г. – Минск : Изд. центр БГУ, 2019. – С. 145–150.

3. Сунь Янь. Способ инновации в интернационализации высшего образования в геоэкономической стратегии «Один пояс – один путь» / Янь Сунь // Гуманитарный вектор. – 2017. – Т. 12. – № 3. – С. 30–34.

4. Тозик, А. А. Об актуальности и проблемах формирования белорусской школы китаеведения / А. А. Тозик // Школа молодого китаеведа: приоритетные направления исследования современного Китая и актуальные задачи формирования белорусской школы китаеведения : сб. ст. участников Школы молодого китаеведа, Минск, 28 февраля 2020 г. / под ред. проф. А. А. Тозика. – Минск : Изд. центр БГУ, 2020. – С. 3–12.

5. Хухлындина, Л. М. Беларусь – Китай: новые форматы сотрудничества в системе высшего образования / Л. М. Хухлындина, Т. Н. Кузьминова, В. М. Молофеев // Современный Китай: построение социализма с китайской спецификой новой эпохи : материалы Междунар. науч. конф., Минск, 29 марта 2019 г. / под ред. проф. А. А. Тозика. – Минск : Изд. центр БГУ. – 2019. – С. 198–207.

**Вуришана**
*Белорусский государственный экономический университет*
*(г. Минск, Республика Беларусь)*

# РОЛЬ БЕЛАРУСИ В РЕАЛИЗАЦИИ ИНИЦИАТИВЫ «ОДИН ПОЯС, ОДИН ПУТЬ»

*В статье представлено нормативное правовое обеспечение китайско-белорусского инвестиционного сотрудничества в рамках реализации совместных проектов инициативы «Один пояс, один путь» в Республике Беларусь. Описаны основные преимущества проектного финансирования за счет средств китайской кредитной линии. Обосновываются перспективы дальнейшего взаимодействия двух государств в инвестиционной сфере.*

**Ключевые слова:** *прямые иностранные инвестиции, Китайская Народная Республика, Республика Беларусь, международное инвестиционное сотрудничество, «Один пояс, один путь», «Великий камень».*

*The article presents the normative legal support of the Chinese-Belarusian investment cooperation in the framework of joint projects of "The one belt, one road" Initiative in the Republic of Belarus. The main advantages of project financing at the expense of the Chinese credit line are described. The prospects for further cooperation between the two States in the investment sphere are substantiated.*